Весці БДПУ. Серыя 1. 2017. № 3. С. 119–123.

УДК 821.161.3+821.162.1М.Стральцоў, М.Хласко

# ПРАБЛЕМА ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛЬНАГА ВЫБАРУ Ў КАНТЭКСЦЕ ЖЫЦЦЁВАГА ШЛЯХУ ГЕРОЯЎ ПРОЗЫ МІХАСЯ СТРАЛЬЦОВА І МАРЭКА ХЛАСКО

**Д. І. Бурко,**
*аспірант кафедры беларускай літаратуры і культуры БДПУ*

Паступіў у рэдакцыю 15.06.17.

UDC 821.161.3+821.162.1М.Стральцоў, М.Хласко

# THE PROBLEM OF EXISTENTIAL CHOICE IN THE CONTEXT OF HEROES' LIFE PATH IN WORKS BY MIKHAS STRELTSOV AND MAREK HLASKO

**D. Burko,**
*Post-Graduate Student of the Deparment of Belarusian Literature i culture, BSPU*

Received on 15.06.17

У артыкуле на прыкладзе творчасці беларускага пісьменніка М. Стральцова і польскага празаіка М. Хласко разглядаецца ўзаемадзеянне асабовых якасцей героя са спецыфікай знешніх абставін, у межах якіх ажыццяўляецца выбар персанажамі лініі паводзін. Стратэгія выбару жыццёвага шляху літаратурнымі героямі беларускага і польскага аўтараў у шматлікіх кантэкстах сацыяльных узаемадзеянняў абумоўлена іх узроўнем свядомасці і здольнасцю адпаведна ўспрымаць выпрабаванні знешніх абставін.

*Ключавыя словы:* экзістэнцыяльны выбар, жыццёвая дарога, лірычны герой, крытычная сітуацыя.

On the example of works by Belarusian writer M. Streltsov and Polish writer M. Hlasko the article investigates the interaction of the hero's personal qualities with the specifics of the environment which influence their conduct. The strategy of choosing the life path in social conditions by literary heroes of Belarusian and Polish authors depends on the level of consciousness of the characters and their abilities to orrectly perceive the tests of external circumstances.

*Keywords:* existential choice, life path, lyrical hero, critical situation.

Параўнальнае вывучэнне літаратуры – вельмі важны і актуальны кірунак для сучасных навукоўцаў. А. Верабей піша: «Параўнальнае вывучэнне літаратур з'яўляецца адным з асноўных напрамкаў літаратуразнаўства. На сучасным этапе, калі адбываюцца працэсы інтэнсіўнага ўзаемазбліжэння і ўзаемаўзбагачэння нацыянальных культур, перад беларускімі літаратуразнаўцамі стаіць задача усебакова даследваць беларускую літаратуру ў параўнальна-супастаўляльным плане ў першую чаргу з суседнімі рускай, польскай, украінскай, літоўскай, латышскай літаратурамі» [1, с. 3]. Узаемастасункі беларускай і польскай літаратур цікавыя для літаратуразнаўцаў абедзвюх краін тым, што ментальнасць гэтых народаў роднасная, пераплеценая каранямі ў гісторыі. Варта згадаць шматвекавую агульную гісторыю, выпрабаванні, якія збліжаюць лепш за самыя блізкія ўніі, неаднаразовае перасоўванне межаў, польскамоўны перыяд у беларускай літаратуры, які нарадзіў цэлую плеяду сусветнавядомых пісьменнікаў, мастакоў, дзеячоў культуры ў шырокім разуменні гэтага слова. На сучасным этапе, калі адбываюцца працэсы ўзаемазбліжэння і ўзаемаўзбагачэння нацыянальных культур Польшчы і Беларусі, перад айчыннымі літаратуразнаўцамі стаіць задача ўсебакова даследаваць беларускую літаратуру ў параўнальна-супастаўляльным плане ў першую чаргу з польскай літаратурай, як з найбольш блізкай і роднаснай беларускай літаратуры. Гэта дазволіць раскрыць новыя старонкі яе развіцця, глыбей зразумець гістарычныя падзеі, іх вынікі і перадумовы, убачыць унутраны партрэт беларуса і паляка, прачытаць іх думкі, перажыванні, зразумець іх выбар, які павінны зрабіць героі твораў беларускіх і польскіх пісьменнікаў. У прыватнасці, мы глыбей засяродзімся над экзістэнцыяльнай праблемай выбару, важнай як для мастакоў слова, так і для герояў па розныя бакі геаграфічных і моўных межаў.

Выбар – вырашэнне пэўнай праблемы ў жыцці чалавека ва ўмовах шматлікіх альтэрнатыў. У працэсе вырашэння задачы заўсёды ўзнікае некалькі варыянтаў. Гэта адбываецца і выпадкова, у сілу неадназначнасці і нявызначанасці працэсу рашэння, і мэтанакіравана, як асновы пошуку лепшага выніку. Але задача лічыцца вырашанай тады, калі будзе зроблены выбар канчаткова, адзінага варыянту. Толькі такая дзейнасць лічыцца плённай.

Беларускі і польскі пісьменнікі М. Стральцоў і М Хласко жылі і працавалі ў ХХ ст. Дзяцінства абодвух творцаў прыпала на ваенны час: нішчымніца, вайна, фашызм, няпросты час паваеннага будавання камунізму, з аднаго боку, а з другога – маладосць, каханне, прага інтэлектуальнага, кніжнага насычэння, пошукі свайго месца ў грамадстве. Усё гэта яднае пісьменнікаў суседніх краін, але ў іх жыццёвым і творчым лёсе ёсць

і адрознае, тое, што з'яўляецца адметнасцю кожнага асобна ўзятага пісьменніка.

У апавяданні «Што будзе сніцца» герой М. Стральцова ўспамінае дні сваёй маладосці, тыя юнацкія, перапоўненыя спадзяваннямі хвіліны радаснага чакання шчаслівай будучыні, але таксама і моманты выбару, выбару, за які цяпер герою сорамна і крыўдна, бо не хапіла смеласці, рашучасці загаварыць, прызнацца, адкрыцца ў сваіх пачуццях да той, якой ён нават і не памятае імя, але тады, ды зрэшты і цяпер, яе вобраз стаіць перад вачыма і няспынна круціць адно і тое ж пытанне ў галаве. Чаму не хапіла рашучасці?

Было гэта даўно і амаль забылася, сцерлася з памяці, герой нават не ўзгадваў яе столькі гадоў, ды і што там было ўзгадваць, але сон, дзіўны сон, вярнуў яго ў тыя часы. Чаму яна прыснілася яму: «Аднойчы ноччу яму прыснілася яна. Прачнуўшыся, ён ніяк не мог даўмецца, адкуль гэты сон: пра яе ніколі, здаецца, не думаў, ды, папраўдзе, і думаць не было чаго. Была некалі, больш за дзесяць гадоў, кароткая дарожная сустрэча, і ён ужо не помніў цяпер яе імя, а можа, нават і тады не ведаў яго» [2, с. 249]. Дзіўны, як падалося чалавеку, сон прымусіў героя прабудзіцца і ўжо не даў заснуць зноў. Думкі, успаміны нахлынулі на яго. Герой узгадвае сябе ў тыя, як цяпер яму падаецца, далёкія часы: «Гэткі нехлямяжы, сарамлівы быў тады ён: ведама, вясковы хлопец, што першы раз выбраўся ў далёкі свет са свайго глухога селішча. Скончыў дзесяцігодку, завербаваўся з двума вясковымі старэйшымі хлопцамі на лесаапрацоўкі – лічы, было яму тады васямнаццаць гадоў» [2, с. 249]. Прайшло з той пары дзесяць гадоў. Ужо цалкам іншае жыццё, іншыя пытанні. Праблемы штодзённага клопату турбавалі героя, ад іх вырашэння залежыў і дабрабыт сям'і, і спакойныя ўзаемаадносіны з жонкай і дачкой. Але чаму так узварушыў мужчыну звычайны сон: «Ён яшчэ ва ўладзе сну, цяпер успамінаў усё гэта: сваю сарамяжлівасць, штодзённыя, штохвілінныя пакуты праз яе, паспешлівыя, несправядлівыя думкі пра людзей, смешную сваю задзірлівасць, прагу цвёрдых і мужных учынкаў, адзінокай рамантыкі і – салодкае, трывожнае заміранне сэрца перад нязведанным жыццём. Ах, маладосць, маладосць, наіўная, смешная, незваротная маладосць» [2, с. 250].

Чалавек з самага маленства кожны дзень стаіць на парозе выбару – як не памыліцца, як зрабіць правільна, лепш для сваёй будучыні. Выбар не заўсёды прысутнічае ў крытычных, памежных сітуацыях, часам ён паўстае ў моманты спакою, але ад гэтага выбару, не менш важнага, залежыць будучы чалавечы лёс. М. Стральцоў па-мастацку апісвае пачуцці героя, вынікам якіх паслужыў зроблены ў далёкім юнацтве выбар: пайсці вучыцца, каб не працаваць усё жыццё на заводзе. Але цяпер на адзіноце, ціхай ноччу, калі ўся сям'я соладка спіць, герой успамінае тыя далёкія часы, калі працаваў на заводзе і паралельна вучыўся, каб там не працаваць у будучым. Па-мастацку хораша, пачуццёва-вобразна перадае М. Стральцоў пачуцці героя: «За акном стоена і ціха ўладарыла мутнаватая зімовая ноч, і ён нечакана падумаў, што скора, мусіць, шэсць гадзін, час, у які заўсёды ўставаў яшчэ тры гады назад, калі хадзіў на завод і вучыўся ў інстытуце, і цяпер, успомніўшы пра гэта, са смуткам пашкадаваў, што мінулася тая пара, што цяпер, ходзячы ў канструктарскае бюро, ён устае пазней і не бачыць ранішняга людскога натоўпу ля трамвайных прыпынкаў, ля заводскіх варот, не чуе, як сіплымі пасля сну галасамі гавораць людзі, не бачыць, як раздзімае ў прыцемку вецер зыркія цыгаркі, не адчувае той асаблівай еднасці з горадам, з людзьмі, якую заўсёды адчуваў у рабочым натоўпе» [2, с. 250].

Сцішаны на адзіноце сам з сабою герой разважае, яго разважанні – гэта ўспаміны пра той мінулы выбар, які паўплываў на яго далейшае жыццё. Мужчына ўзгадаў дзяўчыну, імя якой ён не памятаў, а можа і не ведаў. Салодкія ўспаміны юнацкіх часоў трымаюць у палоне героя: «Ехалі яны ў адным купэ: ён заняў верхнюю паліцу, паставіўшы туды свой чамадан, яна была на ніжняй, і, калі прыйшла пара спаць, ён саромеўся лезці пры ёй у свой высокі бярлог. Яшчэ ён думаў, што трэба было б зняць з паліцы, паставіць кудынебудзь чамадан, каб не замінаў спаць, але ведаў, што не зробіць гэтага, і нічога не рабіў, пакуль яна сама не прымусіла яго дастаць чамадан і паставіць побач са сваім у скрыню: ніжнюю паліцу, сказала яна, можна падняць, во, глядзіце, усё робіцца проста» [2, с. 252]. Юнак саромеўся, яму падавалася, што кожны яго рух, рух вясковага хлопца, будзе недарэчным, лепш маўчаць, схавацца і не гаварыць, можа заснуць. Але яму так хацелася, каб яна сама загаварыла, каб цягнік не спыняўся ніколі, каб гэтая вандроўка не канчалася. Ён марыў пра тое, як заробіць шмат грошай і абавязкова ажэніцца з ёй, з дзяўчынай сваёй мары, як яму падалося: «І ён амаль усю ноч думаў, як бы хучэй зарабіць вялікія грошы, купіць сабе касцюм, паліто, уставіць залаты зуб, як у Цімошыхінага Лёнькі, і, можа, ажаніцца з ёй» [2, с. 252].

Герой М. Стральцова вагаўся. Страх – кепскі дарадчык, калі трэба прыняць важнае рашэнне, зрабіць выбар, і хлопец нерваваўся, злаваўся на тых, хто гаварыў з ёй, злаваўся на сябе, на сваю нерашучасць, круціўся усю ноч на канапе-паліцы цягніка, нібы на мулкай вясковай драўлянай лаве, а раніцай было ўжо позна, яна зышла раней: «Першы ён баяўся загаворваць з ёй, яго злавала, што тыя, хто ехаў з ім, не заўважалі, не разумелі, што яна была яна, – смела загаворвалі з ёй, жартавалі, а яна, – таксама знайшла каму, – ахвотна адказвала ім – то сур'ёзна, то жартам. <…> А раніцай, калі іх высаджвалі на бераг, ён

дарэмна шукаў яе ў натоўпе: яна са сваёй групай, мусіць, сышла на бераг раней...» [2, с. 252]. Выбар зроблены, ён не благі і не добры, ён такі, які ёсць. Вынікам яго стала сённяшняя рэчаіснасць і успаміны: «За акном стоена і ціха ўладарыла зімовая ноч, а ён сядзеў упоцемках, курыў, думаў: што сказаў бы ён, каб раптам на кухню прыйшла жонка, спытала, чаго сядзіць ён тут, успароўшыся сярод ночы?..» [2, с. 252]. Жонка напэўна не зразумела б яго, ды і навошта ёй разумець. Гэта быў яго выбар, і ён зроблены.

М. Стральцоў – пісьменнік глыбока пачуццёвы. Яго героі заўсёды сутыкаюцца з унутраным выбарам, не заўсёды заўважным на першы погляд. А. Адамовіч піша: «І што яшчэ характэрызуе глыбіню і ўзровень прозы Міхася Стральцова, дык гэта тая лёгкасць, з якой можам уявіць лёс яго герояў у зусім іншай сітуацыі і нават у іншым часе. Бо яны жывыя – кожнай сваёй думкай-клопатам, кожным пачуццём-перажываннем» [3, с. 230].

Польскі пісьменнік Марэк Хласко – празаік цікавага і непростага творчага лёсу. Ён узрушыў у свой час сацыялістычную Польшчу шчырасцю сваіх апавяданняў. Мастак не баяўся гаварыць праўду, пісаць простай мовай маладых людзей з вуліцы. Апавяданні М. Хласко прасякнуты надзённымі праблемамі простых палякаў. Выбар, перад якім ставіць пісьменнік сваіх герояў, складаны, не заўсёды прыемны, але такі жыццёвы, будзённы. Анджэй Гас піша: «Teksty Hłaski były napisane potocznym językiem, autor nie unikał sentymentalizmu, który zderzał z brutalnością» [4]. (пераклад мой) Тэксты М. Хласкі былі напісаныя гутарковай мовай, аўтар не пазбягаў сентыменалізму, які мяжуе часам з брутальнасцю.

У апавяданні «Прыгожая дзяўчына» («Śliczna dziewczyna») пісьменнік ставіць маладых людзей, хлопца і дзяўчыну, перад складаным экзістэнцыяльным выбарам, ён у кожнага свой, але прычына, якая давяла да гэтага выбару, адна і тая ж – гэта заўчасная цяжарнасць як вынік неабдуманых дзеянняў і некантраляванага сэксуальнага жыцця. Польскі пісьменнік і журналіст Анджэй Гас піша: «Była to prościutka historia o urodziwej dziewczynie siedzącej z chłopakiem na ławce w parku. Jej widok budzi w przechodniach uczucia wzniosłe i szlachetne. Tymczasem dziewczyna, uosobienie czystej niewinności, kłóci się z chłopakiem o pieniądze na skrobankę. On nie chce zapłacić, a wtedy ona grozi mu donosem, bo sfałszował ankietę personalną» [4]. (Была гэта просценькая гісторыя пра прыгожую дзяўчыну, якая сядзела з хлопцам на лаўцы ў парку. Яе выгляд нараджае пачуцці высокія, эстэтычныя ў вачах тых, хто яе бачыць. Тым часам, гэта дзяўчына, увасабленне чыстай харашыні, спрачаецца з маладым чалавекам пра грошы на аборт, ён не хоча даць тых грошай, тады дзяўчына пагражае, шантажуе яго тым, што напіша данос пра тое, што ён сфальсіфікаваў персанальную анкету).

М. Хласко ставіць сваіх герояў перад складаным жыццёвым выбарам, выбарам экзістэнцыянальным, ад якога шмат што залежыць. Дзяўчына абвінавачвае хлопца ў тым, што праз яго яна зацяжарыла, а паколькі гэта нечаканае дзіця, то яна вымушана яго пазбавіцца. Няпросты выпадак ускладняецца яшчэ і тым, што малады чалавек не верыць у тое, што тым вечарам ён быў у яе адзін. Хлопец: «– Ty bardzo pięknie mówisz – rzekł – i na pewno bardzo wzruszająco. Ale ja nie byłem wtedy sam. Był i Mietek, i Roman, i jeszcze paru innych. Dlaczego przychodzisz do mnie po forsę? Czy ja jestem świętym Mikołajem?

- Ja z tamtymi nic nie miałam.

- Wychodziłaś z nimi na dwór.

- Po to, żeby odetchnąć i przejść się kawałek. Była wtedy taka piękna noc...

- Ach tak – powiedział obojętnie. Zgasił papierosa i oparłszy ramiona o poręcze ławki, przeciągnął się. Patrzył chwilę na wygasające niebo, potem rzekł: – Przykro mi, ale ja już dawno przestałem wierzyć w cuda. Jeszcze nie słyszałem, aby dziewczyna szła w nocy nad rzekę z mężczyzną li tylko po to, aby popatrzeć na księżyc. Zwykle księżyc w takim wypadku kapuje na nich.» [5]. (Ты кажаш вельмі прыгожа, – сказаў ён, – і, вядома, вельмі кранальна. Але тады я быў не адзін. Быў і Мётэк, і Раман, і некаторыя іншыя. Чаму ты прыйшла да мяне па грошы? Ці можа я Святы Мікалай?

– З тымі, у мяне не было нічога.

– Ты выходзіла з імі на двор.

– Проста мы дыхалі і гулялі трохі. Яна была такая прыгожая, ноч...

– Ах, так, – сказаў ён абыякава. Ён затушыў цыгарэту і, паклаўшы рукі на парэнчы лавы, пацягнуўся. Ён глядзеў, як паволі пагасае неба, потым сказаў: – Мне вельмі шкада, але я ўжо даўно перастаў верыць у цуды. Я не чуў, каб дзяўчына пайшла ноччу з хлопцам на раку, каб толькі паглядзець на месяц, за звычай месяц у такіх сітуацыях даносіць).

Маладымі людзьмі кіруе страх, ім страшна браць адказнасць за свае ўчынкі, віну хочацца перакласці на плечы іншага. Але дадзены выбар абумоўлены складанасцю сітуацыі, у якую патрапілі хлопец і дзяўчына. Яны бачаць выйсце ў шантажы, выбар прыпадае на запалохванне непрыемнай сакрэтнай інфармацыяй, пра якую ніхто не ведае і ніхто не павінен здагадацца. Малады чалавек пужае дзяўчыну тым, што можа расказаць яе хлопцу, які зараз у войску, пра тое, як яго каханая «верна» чакае свайго любага: «Jest noc, pewien chłopak będący w wojsku myśli o swej dziewczynie i marzy o chwili, kiedy będą razem. Pełni oczywiście wartę... Ładne, prawda? Tymczasem... – Zbliżył ku niej twarz i powiedział twardo: – Tymczasem dziewczyna bawi się w „Kameralnej” z dwoma podtatusiałymi facetami, którzy mają jeszcze sklepiki na ulicy Chmielnej i sflaczałe nogi. Ta dziewczyna jedzie potem do jednego z nich, a jest zupełnie zalana. I potem ta

dziewczyna barłoży się z tymi facetami do rana. Rano oczywiście opowiada im wzruszającą historyjkę o tym, że jej ojciec siedzi niewinnie w więzieniu i że ona z matką cierpią głód. Potem pożycza od jednego z nich pięćset złotych i kupuje sobie dwie pary nylonów. Życiowe, co?» [5]. (Ноч, хлопец, які знаходзіцца ў войску думае аб сваёй дзяўчыне і марыць пра час, калі яны будуць разам. Ён, вядома, ахоўвае ... Выдатна, праўда? У той жа час ... – Ён наблізіўся да яе твару і цвёрда сказаў: – Між тым дзяўчына забаўляецца ў «Камерным» з двума хлопцамі, якія маюць крамы на вуліцы Хмельнай. У іх тоўстыя, з абвіслым цягліцамі ногі. Гэта дзяўчына затым паедзе да аднаго з іх, страшэнна п'яная, а потым будзе забаўляцца з імі да раніцы. Раніцай, вядома, яна распавядзе кранальную гісторыю пра свайго бацьку, які сядзіць у турме нявінна, і што яна з маці пакутуе ад голаду. Тады адзін з іх пазычыць ёй пяцьсот злотых, і яна набудзе дзве пары калготак. Жыццёва, так?)

Дзяўчына, баронячыся, таксама намагаецца напалохаць юнака тым, што ведае яго сакрэты, яго таямніцу, выдаўшы якую, можа паламаць хлопцу ўсё жыццё: «– Tak sobie. Znam bardziej ciekawe bajeczki. Słyszałam historię o takim młodym chłopaku, który sfałszował pewne dane w ankietach, aby dostać się na studia, i wygłaszał wzruszające rzeczy do czasu, kiedy było mu to potrzebne. Nauczył się nawet mówić gwarą podwarszawską, gdyż utrzymywał, iż jest autentycznym proletariuszem. Tymczasem tatunio przysyłał mu paczki z Nowego Jorku, tak że chłopak był nawet nieźle ubrany, gdyż tatunio umiał i tam robić ciekawe interesy. Tatunio, ten bezrobotny tokarz z ankiety. Jak myślisz: interesujące?» [5]. (Нічога асаблівага, ведаю больш цікавую гісторыю. Магу расказаць пра маладога хлопца, які сфальсіфікаваў асабістыя дадзеныя ў анкеце, каб паступіць ва ўніверсітэт. Навучыўся нават гаварыць на падваршаўскай гаворцы, каб усе думалі, што ён тыповы прадстаўнік рабочага класа. Тым часам тата дасылаў яму пасылкі з Новага Ёрку, таму хлопец прыгожа апранаўся. Яго бацька ўмеў і там наладзіць бізнес. Згодна з анкетай яго тата беспрацоўны токар. Як думаеш, цікавая гісторыя?)

М. Хласко ў апавяданні распрацоўвае дзве сюжэтныя лініі, яны шчыльна пераплецены паміж сабой. Першая – гэта спрэчка маладых людзей, а другая – гэта кантэкст, у якім адбываецца сам канфлікт. Ціхая прыгажосць летняга парку, выпадковыя мінакі, якія праходзяць каля нашых герояў, іх думкі, гісторыі жыцця. Глыбока і сцісла пісьменнік перадае вобразы і гісторыі людзей, якія з'яўляюцца перад героямі твора пакуль мінаюць лаўку, дзе яны сядзяць. Аб'ёмна выпісаны партрэты мінакоў, і нават здаецца, што кожны з іх – галоўны персанаж апавядання: «Przechodził koło nich jakiś mężczyzna w granatowym kiepskim garniturze.

Był to nieznaczny urzędnik: nie osiągnął w życiu niczego, gdyż brakło mu i talentu, i wytrwałości. Jak każdy tego rodzaju człowiek uważał się jednak za skrzywdzonego i niezrozumianego. Popatrzył na śliczną dziewczynę i pomyślał: „Mój Boże! Gdybym ja miał taką! Może by to wszystko zaczęło być inne? Taka kobieta może odmienić wszystko; może dla niej wziąłbym się jeszcze za coś? A tak – złamane życie. Ech, cholera! Muszę iść do kina. Człowiek zaczyna się rozklejać..." Posmutniał i przyśpieszył kroku.» [5]. (Праходзіў побач нейкі мужчына ў кепскім цёмна-сінім касцюме. Быў гэта звычайны дробны чыноўнік, які не дабіўся ў жыцці ніякіх вялікіх поспехаў, не хапіла яму ані таленту, ані цярплівасці. Але як і кожны такога кшталту чалавек, быў пакрыўджаны на ўсіх, што яго не дааценілі. Паглядзеў на прыгожую дзяўчыну і падумў: «Мой Божа, каб у мяне была такая! Можа б усё змянілася да лепшага? Такая жанчына можа усё змяніць, можа дзеля яе пачаў бы нешта рабіць, узяўся яшчэ за нешта, а так – зламанае жыццё. Эх, блін, мушу ісці ў кіно. Чалавек пачынае расклейвацца…» Пахмурнеў і прыбавіў кроку).

Людзі, якія праходзілі каля той лаўкі, дзе сядзелі героі апавядання, мелі свой клопат, свой лёс, але кожны, гледзячы на такую прыгожую дзяўчыну і яе спадарожніка, адчувалі ўнутранае ўзбуджэнне. Мінакі думалі, што маладыя людзі самыя шчаслівыя, а як іначай, яны ж такія прыгожыя. Кожны хацеў быць на іх месцы, маляваў сабе салодкія перспектывы, марыў: «Człowiek, który w tej chwili przechodził koło nich, spojrzał na nią, potem na jej ręce i zaparło mu dech. Był on młodym pisarzem i marzył o napisaniu wielkiej, miłosnej powieści, na którą tak bezustannie i boleśnie oczekują ludzie. W tej chwili – z przerażającą jasnością – ujrzał całość; od wielu miesięcy już trzepotały mu się po głowie sceny, dialogi, twarze, lecz dopiero w tej chwili ujrzał swoje dzieło jako myśl skończoną. «Już mam – kombinował gorączkowo. – Teraz już mam. Oni spotkali się przypadkowo na ławce w tym parku. Zawiązuje się romans, pierwsza miłosna noc... Traktują to wszystko cynicznie, sportowo, gdyż tak sobie postanawiają, aby uniknąć komplikacji i rozczarowań. Lecz z czasem – przychodzi miłość. Wielka, obezwładniająca, rzucająca na kolana. Ale oni nie mogą w to uwierzyć; dręczy ich cyniczny początek. Lecz w końcu rozumieją; pozostaną już razem, na zawsze złączeni uczuciem. To będzie rzecz pełna gniewu!..." Uradowany pogalopował do domu» [5]. (Чалавек, які ў той момант праходзіў каля іх, паглядзеў на яе, пасля на яе рукі, і яму заняло дух. Гэта быў малады пісьменнік, які марыў пра тое, каб напісаць вялікі раман пра каханне, якога так прагнуць усе людзі. У гэтую хвіліну ён ясна ўбачыў тое, што так доўга шукаў, чаго не мог зразумець, адчуць, тое, што так шукаў для напісання сваёй кнігі. «Гатова, канец, круцілася ў яго галаве. Яны выпадкова сустрэліся ў гэтым парку.

Паміж імі ўзнікае раман, першая ноч жарсці… Яны ставяцца да гэтага цынічна, як да нейкага спорту, але з цягам часу прыходзіць сапраўднае каханне, моцнае, усеўладнае, якое можа нават забіць, але яны не могуць у гэта паверыць, бянтэжыць іх цынічны пачатак. Але з часам пачынаюць разумець. Што ўжо назаўсёды застануцца разам, злучаныя гэтым моцным пачуццём. Гэта будзе раман поўны гневу!…» Узрадаваны, ён пабег дадому). Юнак і дзяўчына на лаўцы былі натхненнем для адных і смутным напамінам для другіх. Вакол іх віравала жыццё, а яны былі забойцамі новага жыцця. Выбар людзей, што ішлі міма, быў у тым, каб натхняцца і марыць, іх жа выбар скіроўваў на тое, каб забіць таго, хто павінен быў нарадзіцца. М. Хласко па-мастацку тонка і глыбока паказаў два палярныя бакі адной жыццёвай сітуацыі.

М. Хласко прапануе задумацца над простымі жыццёвымі рэчамі, над адказнасцю за той выбар, які чалавек робіць кожны дзень. Часта гэты выбар, паводле пісьменніка, тычыцца штодзённых рэчаў. І вонкавая прыгажосць не з'яўляецца абавязковым шчасцем. Пётар Пентак пра М. Хласко пісаў: « … tylko sztuka łączy ludzi, a to co dzieje się, miedzy dwoma kochankami jest największym dziełem sztuki» [4]. (… Толькі мастацтва яднае людзей, а тое, што адбываецца паміж закаханымі, і ёсць найвышэйшае мастацтва).

Такім чынам, праблема выбару, з якой сутыкаюцца героі апавяданняў беларускага і польскага пісьменнікаў, вельмі няпростая, глыбока індывідуальная, яе вырашэнне патрабуе вялікіх душэўных намаганняў. Мастацкія творы пісьменнікаў засведчылі, што чалавек у рэальным свеце ўключаны ў вялікую колькасць сацыяльных сістэм, і яго індывідуальны выбар звязаны найперш з іх зместам. Выбар жыццёвага шляху героямі М. Стральцова і М. Хласко залежыць ад іх здольнасцей, уласных патрэб, рэальнай сацыяльнай сітуацыі. Выбар як рэфлексійная дзейнасць персанажа вызначае шляхі яго развіцця як асобы, згарманізаванай унутрана і знешне. Стратэгія выбару жыццёвага шляху літаратурнымі героямі беларускага і польскага аўтараў у шматлікіх кантэкстах сацыяльных узаемадзеянняў абумоўлена іх узроўнем свядомасці і здольнасцю адпаведна ўспрымаць выпрабаванні знешніх абставін.


*Літаратура*

1. *Верабей, А. Л.* Максім Танка і польская літаратура / А. Л. Верабей // Максім Танк і польская літаратура. – Мінск : Беларуская навука, 2012. – С. 3–4.
2. *Стральцоў, М. Л.* Выбраныя творы / М. Л. Стральцоў ; уклад і камент. Міхася Скоблы. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – С. 249–253.
3. *Адамовіч, А.* Міхась Стральцоў – учора і заўтра / А. Адамовіч // Выгнаны патрыцый. – Мінск : Лімарыус, 2017. – С. 227–234.
4. *Gass, A.* Hłasko: pożeracz kieliszków [Электронный ресурс] / A. Gass – Режим доступа: http://niniwa22.cba.pl/hlasko_pozeracz_kieliszkow.htm – Дата доступа: 31.05.2017
5. *Hłasko, M.* Śliczna dziewczyna [Электронный ресурс] / M. Hłasko – Режим доступа: http://mardziusz.w.interiowo.pl/opowiadania/mh/slicznadziewczyna.html. – Дата доступа: 31.05.2017.

*References*

1. *Adamovich, A.* Mikhas Straltsou – uchora i zautra / A. Adamovich // Vygnany patrytsyy. – Minsk : Limaryus, 2017. – S. 227-234.
2. *Verabey, A. L.* Maksim Tank i polskaya litaratura / A. L. Verabey // Maksim Tank i polskaya litaratura. – Minsk : Belaruskaya navuka, 2012. – S. 3-4.
3. *Straltsou, M. L.* Vybranyya tvory / M. L. Straltsou ; uklad i kament. Mikhasya Skobly. – Minsk: Belarus. navuka, 2015. – S. 249–253.
4. *Gass A.* Hłasko: pożeracz kieliszków [Elektronnyy resurs] / A. Gass – Rezhim dostupa: http://niniwa22.cba.pl/hlasko_pozeracz_kieliszkow.htm – Data dostupa: 31.05.2017.
5. *Hłasko M.* Śliczna dziewczyna [Elektronnyy resurs] / M. Hłasko – Rezhim dostupa: http://mardziusz.w.interiowo.pl/opowiadania/mh/slicznadziewczyna.html. – Data dostupa: 31.05.2017.